АНАМАСІЯЛАГІЧНЫ АНАЛІЗ ЯК СРОДАК ЭЎРЫСТЫЧНАЙ СЕМАНТЫЗАЦЫІ ЛЕКСІКІ (на прыкладзе кампазітных неалагізмаў у англійскай мове)

М.М. Міхалевіч,
выкладчык кафедры замежных моў
установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны
педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»

Гуманізацыя і гуманітарызацыя адукацыі, неабходнасць павышэння ўнутранай матывацыі навучэнцаў, рэалізацыя кампетэнтнаснага падыходу да навучання – надзённыя пытанні як для лінгвадыдактыкі, так і для адукацыі ў цэлым. Адным са спосабаў іх вырашэння робіцца пашырэнне эўрыстычных метадаў і форм навучання. Актуальнасць эўрыстычнага навучання з гледзішча развіцця лінгвістычных і міжкультурных кампетэнцый вучняў абумоўленая тым, што яно мае на ўвазе адмову ад выкладання ведаў у гатовым выглядзе і патрабаванняў механістычнага запамінання, грунтуецца на пошуку інфармацыі, яе самастойным асэнсаванні, дазваляе развіваць кагнітыўныя, крэатыўныя і арганізацыйна-дзейнасныя здольнасці вучняў [4, с. 5].

Выкарыстоўванне эўрыстычных метадаў навучання лексіцы магчымае на розных узроўнях навучання і розным матэрыяле, але асаблівае значэнне яно набывае пры працы з неадаптаванымі тэкстамі. Улічваючы сучасныя тэмпы развіцця навукі і тэхналогій, а праз гэта – і тэрмінатворчасці ў адпаведных галінах ведаў, неабходнасць семантызацыі новых слоў паўстае бесперапынна, калі выкладчык хоча выкарыстоўваць у сваёй працы сучасныя напрацоўкі і актуальныя навіны са сфер, цікавых і карысных для будучых спецыялістаў. Паўстае праблема выбару адпаведнага спосабу папярэдняй семантызацыі лексікі. Нягледзячы на тое што перакладныя спосабы семантызацыі застаюцца дастаткова пашыранымі і ў пэўных выпадках могуць мець абгрунтаванне для выкарыстання, хочацца нагадаць, што завучванне ізаляваных слоў пры адсутнасці дэманстрацыі іх сінтагматычных характарыстык супярэчыць не толькі эўрыстычнаму падыходу, але і камунікатыўнаму прынцыпу навучання замежным мовам увогуле і моцна запавольвае развіццё так званага «адчування мовы».

Анамасіялагічны аналіз суадносіцца з асноўнымі этапамі намінацыйнай дзейнасці суб'екта (падрабязна гэтае пытанне разглядалася ў папярэдніх публікацыях: [5, с. 144-149]). У дачыненні да аналізу ў шырокім сэнсе (скіраваным не толькі на лексіку) У.Р. Гак вылучае наступныя этапы анамасіялагічнага аналізу: 1) вызначэнне аб'екта (паняцця) у якасці зыходнага элемента; 2) выяўленне разнастайных сродкаў выражэння дадзенага значэння; 3) фарміраванне семантычнага поля, якое суадносіцца з дадзеным паняццем і паміж кампанентамі якога ўсталёўваюцца сінтагматычныя, семантычныя і стылістычныя адрозненні [3, с. 289].

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Такім чынам, вучні мусяць самастойна або з апорай знайсці адказы на пытанні, што называецца (прадмет, з'ява, жывы суб'ект, характарыстыка і г. д. – ступень дэталізацыі залежыць ад узроўню вучняў і ад магчымасцяў, прадастаўленых вузкім кантэкстам), якія сродкі выражэння даюць падставы пра гэта меркаваць (вычляненне знаёмых элементаў у новым слове), чаму яно так называецца і, нарэшце, як новая адзінка звязаная з іншымі словамі, як яе можна ўжываць.

На наш погляд, бесперакладныя спосабы семантызацыі з'яўляюцца асабліва актуальнымі пры працы з неалагізмамі ў англійскай мове. Пытанне пра магчымасць ужывання перакладных спосабаў і слоўнікавых дэфініцый здымаецца, калі справа датычыць тых неалагізмаў, якія яшчэ не патрапілі ні ў дзвюхмоўныя, ні ў тлумачальныя слоўнікі, але часта з'яўляюцца ключавымі для разумення тэкстаў на надзённыя тэмы. У такіх выпадках, калі новае слова не з'яўляецца запазычаннем з трэцяй мовы, а створана з выкарыстаннем наяўных словаўтваральных сродкаў англійскай мовы, анамасіялагічны аналіз можа выступаць найбольш абгрунтаваным спосабам семантызацыі. У працэсе аналізу ствараюцца ўмовы, калі замежная мова прымае ролю як мэты, так і сродку навучання, з'яўляючыся, такім чынам, ідэальным грунтам для развіцця творчых здольнасцяў навучэнцаў [7] паралельна з набыццём імі лінгвістычных кампетэнцый.

Усяму вышэйпералічанаму спрыяюць таксама пэўныя характарыстыкі новых слоў, якія з'яўляюцца ў англійскай мове ў апошнія гады. У межах гэтага артыкула мы разглядаем 115 новых лексічных адзінак, зафіксаваных у блогу Кембрыджскага слоўніка за апошнія 8 месяцаў, пачынаючы з чэрвеня 2017 г., і адабраных шляхам суцэльнай выбаркі [8]. Усе гэтыя словы і фразавыя найменні ўжываліся ў англамоўным перыядычным друку і анлайн-выданнях у 2016–2018 гг. і аб'ядноўваюцца не толькі часам першай пісьмовай фіксацыі, але і пэўнымі структурнымі характарыстыкамі, сярод якіх можна вылучыць наступныя:

1. Выключна высокая доля кампазітаўтварэння і абрэвіяцыі.
2. Высокая доля спосабаў так званага аказіянальнага кампазітаўтварэння (перадусім кантамінацыі, элементаў міжслоўнага накладання).
3. Высокая ступень эліптычнасці значэння, фіксацыя згорнутай этымалагічнай гісторыі ў форме новай лексічнай адзінкі.
4. Пашыранасць квазікампазітаў.
5. Нізкая доля чыста суфіксальных утварэнняў.
6. Абсалютная большасць прадстаўленых слоў – назоўнікі, сярод якіх прадстаўленыя як апрадмечаныя назвы працэсаў або прыкмет, так і прадметныя найменні ў вузкім сэнсе тэрміна.

Са 115 прааналізаваных адзінак 56 уяўляюць сабой падзельнаафармленыя кампазіты з падзельным або дэфісным напісаннем (*procrastination nan-*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ny, tombstone tourist; *self-disruption, robo-adviser* і да т. п.), 3 – кампазіты, утвораныя шляхам аснова- або словаскладання (*swimrun*, *thundersnow*, *guideshop*), 3 – складанасуфіксальныя словы (*rooftopper, doorbuster, crowdspeaking*), 13 – квазікампазіты (*megamoon, gigamansion* і да т. п.), 4 утвораныя з выкарыстаннем літарнай або гукавой абрэвіяцыі (*F rating, OLED, FODMAP, Q*). Калі ўлічваць не толькі традыцыйныя спосабы кампазіцыі, мы заўважым, што насамрэч словаскладанне выкарыстоўваецца яшчэ шырэй і прысутнічае ва ўсіх адзінках з прааналізаванай выбаркі, за выключэннем утвораных шляхам чыстай суфіксацыі (*linkster* і *stoozing*) або чыстага ўсячэння *(equel* – паводле аналогіі з *prequel* і *sequel)*. На жаль, аб'ём артыкула не дазваляе падрабязна ахарактарызаваць усе словы з выбаркі, таму мы спынімся толькі на выпадках, якія найбольш выразна ілюструюць адзначаныя тэндэнцыі.

Уражальна высокая ўдзельная вага выпадкаў так званага аказіянальнага кампазітаўтварэння прымушае паставіць пытанне, ці варта па-ранейшаму іх лічыць аказіянальнымі для англійскай лексікі на сучасным этапе яе развіцця. Найшырэй прадстаўленыя спосабы, якія, абапіраючыся на іх характарыстыку Г.В. Басавай, можна акрэсліць як кантамінацыі і міжслоўныя накладанні [1, с. 17].

Кантамінацыйнае ўтварэнне – гэта спалучэнне двух узуальных слоў, у працэсе якога адбываецца збліжэнне рэалій, што знаходзяцца ў аснове намінатыўных значэнняў гэтых слоў. Па форме такое слова ўяўляе сабой злучэнне пачатковай часткі аднаго і канцавой часткі другога слова (перадфрагмента і постфрагмента) [1, с. 17; 2, с. 82]: *furnitecture – furni(ture) + (archi)tecture* ('мэбля, інтэграваная ў архітэктуру будынка'); *femoir – fem(inist)* або *fem(inine) + (mem)oir* ('кніга або твор, напісаныя аўтаркай-жанчынай з феміністычнага гледзішча'); *Fitstagrammer – fit(ness) + (In)stagrammer* ('аўтар блога ў Інстаграм, прысвечанага фітнесу і здароваму харчаванню') і да т. п.

Для сучаснага англійскага кантамінацыйнага складання характэрна тое, што ў якасці перадфрагмента (радзей – постфрагмента) у вялікай колькасці выпадкаў выступае слова цалкам: *BookTuber – book + (You)Tuber* ('відэаблогер, які прысвячае свае відэа рэцэнзіям кніг на YouTube'); *bothie – both [frontal and normal camera] + (self)ie* ('здымак сябе самога, у якім камбінуюцца фатаграфіі, зробленыя франтальнай і звычайнай камерай тэлефона'); *napercise – nap + (ex)ercise* ('аздараўленчы занятак, праграма якога ўключае кароткі сон'); *shoefie – shoe + (sel)fie* ('здымак уласных ног, неабавязкова ў абутку'); *snackadium – snack + (st)adium* ('набор закусак, выкладзеных у форме стадыёна для амерыканскага футболу, які звычайна падаюць падчас прагляду фінальнай гульні за званне чэмпіёна НФЛ ЗША'); *Shuber – sh(oe) + Uber* ('прыгожы, але нязручны абутак на высокім абцасе, які надаецца толькі для таго, каб дайсці да таксі'); *retailtainment – retail +(enter)tainment* ('выкарыстанне гуку,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

асвятлення, забаўляльных мерапрыемстваў для заахвочвання пакупнікоў да набыткаў'); *plandid – (can)did + plan(ned)* ('фота, дбайна і старанна запланаванае да дробязяў (*planned*), але знятае такім чынам, каб выглядаць выпадковым і нязмушаным (*candid*)'); *flightseeing – flight + (sight)seeing* ('авіяэкскурсія па славутых месцах'); *sweatworking – sweat + (net)working* ('спалучэнне заняткаў спортам з пабудовай бізнес-сувязяў'); *honeyteer – honey(moon) + (volun)teer* ('мядовы месяц, які маладыя прысвячаюць валанцёрскай працы за мяжой'); *manfant – man + infant* ('інфантыльны мужчына'); *bleisure – b(usiness) + leisure* ('спалучэнне адпачынку з падарожжам па справах'); *runch – run + (lun)ch* ('прабежка ў абедзенны перапынак') і да т. п.

Захаванне адной з асноў у цэлым выглядзе, з аднаго боку, у пэўным сэнсе спрыяе нераўнапраўнаму прадстаўленню семантычных кампанентаў абодвух матывуючых слоў у новаўтворанай лексічнай адзінцы, з іншага боку – набліжае вышэйапісаныя выпадкі кантамінацыі да міжслоўнага накладання. Міжслоўнае накладанне – накладанне на канец асновы аднаго слова аманімічнага пачатку другога, у выніку чаго ўтвараецца складанае слова, аснова якога ўключае адначасова асновы двух слоў, а семантыка – таксама семантыку абодвух: *flybrary – fly + library* ('лятучая бібліятэка, бібліятэка на борце самалёта'). Да міжслоўных накладанняў прымыкаюць таксама фанетычныя аказіяналізмы ([1, с. 18]), такія як *peticure – pet + pedicure* ('педыкюр для хатніх гадаванцаў').

Высокая ступень эліптычнасці значэння, уласцівая некаторым новым словам, на наш погляд, набліжае іх да фразавых кампазітаў, нягледзячы на ўяўную адпаведнасць гэтых неалагізмаў існуючым правілам лінейнага словаскладання. Так, тлумачэнне такіх лексічных адзінак, як *kittenfishing, veg-ducken, Black Fiveday, reverse advent calendar, soup dumpling, cloud eggs, click farm,* патрабуе раскрыцця згорнутых этымалагічных гісторый, якія стаяць за іх утварэннем, ведання культуразнаўчых і краіназнаўчых рэалій, асаблівасцяў выкарыстання сучасных інтэрнэт-тэхналогій. Адначасова вывучэнне гэтых найменняў з анамасіялагічнага гледзішча спрыяе развіццю міжкультурных кампетэнцый навучэнцаў. Першыя два прыклады з вышэйпералічаных дэманструюць цікавыя выпадкі словатворчасці па аналогіі, калі ў новым складаным слове замяняецца першы элемент ужо існуючага кампазіта: *cat-fishing* ('выкарыстанне фэйкавага акаўнта ў сацыяльных сетках для рамантычных знаёмстваў, у тым ліку з мэтай махлярства') – *kittenfishing* ('выкарыстанне ўласных фатаграфій, зробленых у больш юным узросце, у сацыяльных сетках з той самай мэтай'); *turducken* (ад *turkey + duck + chicken,* 'фаршыраваная страва з індыка, качкі і кураняці, якія запякаюцца адно ў адным, як матрошкі') – *vegducken* ('фаршыраваная страва з трох відаў гародніны, якая найчасцей уключае цукіні, баклажан і мушкатны гарбуз,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

гэткім самым чынам укладзеныя адзін у адзін, як і ў выпадку з невегетарыянскім прататыпам').

Больш простымі для разумення з'яўляюцца найменні *Black Fiveday* ('пяцідзённы перыяд зніжак, прымеркаваны да Дня падзякі') і *reverse advent calendar* ('звычай рабіць дабрачыннае ахвяраванне штодня на працягу Адвенту'), але і ў гэтым выпадку паспяховая эўрыстычная семантызацыя магчымая ў тым выпадку, калі навучэнцы знаёмыя з рэаліямі *Black Friday* і *advent calendar* або хаця б *advent*. Назвы страў, такія як *cloud eggs, bubble waffle, ambient tea, soup dumpling*, для хутчэйшай семантызацыі патрабуюць выкарыстання візуальнай апоры, а анамасіялагічны аналіз у дадзеным выпадку можа выкарыстоўвацца ў якасці дапаможнага сродку развіцця лінгвістычнай здагадкі і акцэнтуацыі разнастайнасці семантычных сувязяў паміж кампанентамі наймення ў англійскай мове: *soup dumpling* – не *супавая клёцка*, а *клёцка, начыненая супам*, *cloud eggs* – не *воблачныя яйкі*, а *яйкі-воблачкі* (пухнатыя, як воблака, бо бялок запякаецца ва ўзбітым выглядзе) і г. д.

Цікавыя прыклады ўяўляюць сабой найменні рэчаў, знаёмых носьбітам беларускай/рускай моў, але яшчэ не асвоеных носьбітамі англійскай, такія як *birch water* ('бярозавы сок') і *raw water* ('сырая вада, якая не праходзіла фільтрацыю або іншую апрацоўку; лічыцца здаравейшай альтэрнатывай і таму даволі дорага каштуе'). Структурна яны хутчэй належаць не да кампазітаў, а да «неаднаслоўных найменняў» («*phrasal names*», паводле Х Гігерыха [9, с. 49]). І адно, і другое найменне патрапілі ў спіс неалагізмаў дзякуючы таму, што рэаліі, якія яны называюць, з'яўляюцца пакуль што чужымі для носьбітаў мовы, у адрозненне ад найменняў фруктовых сокаў (*orange juice, apple juice*) і вадаправоднай вады *(tap water)*. Пры разглядзе гэтых намінацый асаблівае значэнне мае завяршальны этап анамасіялагічнага аналізу, як яго акрэслівае У.Р. Гак (пабудова семантычнага поля), і раскрыццё краіназнаўчых рэалій, а вывучэнне такіх найменняў дапамагае павысіць лінгвакраіназнаўчыя і перакладчыцкія кампетэнцыі навучэнцаў, пазбегнуць у будучыні казусаў у перакладзе назваў кшталту **birch juice* і памылак камунікацыі ў месцах грамадскага харчавання.

Тлумачэнне шэрагу неалагізмаў патрабуе фонавых ведаў з галіны анатоміі, фізіялогіі, хіміі і іншых дакладных навук з прычыны наяўнасці тэрміналагічных кампанентаў, нягледзячы на тое што самі гэтыя неалагізмы вузкаспецыяльнымі тэрмінамі не з'яўляюцца: *dopamine dressing* ('вопратка яркіх колераў, якая спрыяе шчаслівому настрою'), *screen fatigue* ('сіндром стомы, выкліканы доўгай працай за камп'ютарам'), *helix tatoo* ('татуіроўка на знешнім краі вушной ракавіны'). Пры працы з такой лексікай вялікае значэнне мае агульная адукацыя як настаўніка, так і навучэнцаў, валоданне тэматыкай, якой прысвечаны тэкст.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Шырока прадстаўленыя квазікампазіты (тып складаных слоў, які характарызуецца наяўнасцю ў складзе слова як мінімум аднаго радыксоіда інтэрнацыянальнага паходжання і асаблівасцямі марфемнага чляненне) адлюстроўваюць агульную для англійскай, рускай і беларускай моў тэндэнцыю да павелічэння ролі гэтага спосабу ўтварэння новых слоў на сучасным этапе развіцця лексікі розных моў: *sologamy, micro-influencer, transhumanism, biohacking, holoportation, ecotherapy, biobag, macroscope.* Большасць такіх адзінак паддаецца як перакладу, так і семантызацыі на падставе тлумачэння частак слова, але ёсць і выпадкі, якія немагчыма патлумачыць без папярэдняга знаёмства з названымі рэаліямі: *sologamy* (‘неафіцыйная цырымонія шлюбу з самім/самой сабой’), *macroscope* (макраскоп; ‘сістэма алгарытмаў камп’ютарных праграм і матэматычных дзеянняў, якая дазваляе аналізаваць велізарныя аб’ёмы дадзеных пра свет’) і інш.

Выбарка новых слоў дэманструе яшчэ адну тэндэнцыю – спалучэнне розных словаўтваральных сродкаў, з якіх асобна трэба адзначыць складанне ў спалучэнні з усячэннем або іншымі тыпамі абрэвіяцыі: *up lit* (‘літаратурны жанр, які спрыяе аптымістычнаму настрою чытача’), *nanny cam* (‘камера схаванага відэаназірання за няняй’), *F rating* (‘клас фільмаў, створаных пра жанчын або рэжысёрамі-жанчынамі’).

Асноўным з прынцыпаў анамасіялагічнага падыходу з’яўляецца вывучэнне лінгвістычных адзінак у кірунку ад з’явы да яе моўнай аб’ектывацыі. У працэсе намінацыі адбываецца адбор з усёй разнастайнасці прыкмет, адносін і іншых элементаў рэчаіснасці найбольш істотных з пункту гледжання носьбіта мовы паняційных прыкмет, якія адлюстроўваюць уласцівасці прадметаў, і іх замацаванне ў мове. Даючы імя прадмету, чалавек эксплікуе веды аб найбольш істотных уласцівасцях апошняга. Такім чынам, анамасіялагічная прыкмета выказвае найбольш істотныя характарыстыкі аб’екта рэчаіснасці, а таксама адносіны паміж імі, пакладзеныя ў аснову намінацыі. Вывучэнне іншамоўнай лексікі з гэтага гледзішча дае магчымасць адказу не толькі на пытанне, *што* называе лексічная адзінка, але і ў першую чаргу *чаму* прадмет або з’ява атрымліваюць такую назву, што дапамагае замацаваць новае слова ў лексічным запасе навучэнца не ізалявана, а ва ўсёй разнастайнасці яго сінтагматычных і парадыгматычных сувязяў, спрыяе развіццю творчых здольнасцяў і міжкультурных кампетэнцый і цалкам адпавядае патрабаванням эўрыстычнага навучання.

БІБЛІЯГРАФІЧНЫ СПІС:

1. Басова, А. И. Окказиональные слова в современной белорусской художественной речи : автореф. дис. … канд. филол. наук : 10.02.02 / А. И. Басова ; Белорус. гос. ун-т им. В. И. Ленина. – Минск, 1981. – 24 с.
2. Воронин, С. В. Пограничные явления словообразования и фонетики: образование «гаплологических» слов-слитков и композитов / С. В. Воронин // Филол. науки. – 1968. – № 1. – С. 82.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

3. Гак, В. Г. Ономасиология / В. Г. Гак // Русский язык : энцикл. – М. : Бол. Рос. Энцикл., 2003. – 704 с. – С. 289–290.
4. Маглели, А. П. Эвристические методы обучения иностранному языку как условие творческой самореализации учащихся / А. П. Маглели // Английский язык. Приложение к газете «Первое сентября». – 2011. – № 7.– С. 5–7.
5. Михалевич, М. М. Контрастивный ономасиологический анализ и его место в лингвопедагогике / М. М. Михалевич // Предметная и методическая компетентность как важнейшая составляющая профессионального мастерства преподавателя иностранного языка : материалы межвуз. науч.-метод. online-семинара, Минск, 30 марта 2017 г. / Белорус. гос. пед. ун-т им. М. Танка ; редкол.: А. В. Торхова [и др.] ; отв. ред. В. П. Скок. – Минск, 2017. – С. 144–150.
6. Радионова, С. А. Применение эвристических методов в обучении английскому языку / С. А. Радионова // Современные исследования социальных проблем. – 2017. – Т. 8. – № 4-2. – С. 267–271.
7. Скворцова, С. В. Эвристические методы как средство развития творческих способностей учащихся в обучении иностранным языкам / С. В. Скворцова // Интерактивный научно-методический журнал «Сообщество учителей английского языка» [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://tea4er.ru/home/volume3/3151-2013-03-03-14-11-39. Дата доступа: 05.03.2018.
8. Category: New Words // About words: Ablog from Cambridge Dictionary [Electronic resource]. – Mode of access: https://dictionaryblog.cambridge.org/category/new-words/. – Date of access: 05.03.2018.
9. Giegerich, H. J. Lexicalism and modular overlap in English / H. J. Giegerich // SKASE Journal of Theoretical Linguistics Vol. 2. 2005, No.2. – P. 43–62. [Electronic resource]. – Mode of access: http://www.skase.sk/Volumes/JTL03/06.pdf. – Date of access: 05.03.2017.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ